


Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№22 (312) 29 траўня — 4 чэрвеня 2003г. Наклад 11.950 экз. Кошт 400 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by



РАСПИСАНИЕ ДВИЖЕНИЯ ГОРОДСКИХ АВТОБУСОВ НА ЛЕТНИЙ ПЕРИОД

АНОНС

СЛОНІМ



В Слониме нет места одиночеству, считает провинциалка Ольга Шинкевич.

2 стр.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ ПО СОСТОЯНИЮ НА 27 МАЯ 2003 ГОДА

"Беларусбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2000	2045
1 EURO	2360	2480
1 ZL	525	560
1 RUR	64	67


оао "Белпромстройбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2015	2045
1 EURO	2346	2420
1 ZL	520	555
1 RUR	64	66,5

"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2010	2045
1 EURO	2350	2420
1 ZL	480	560
1 UAH	350	400
1 RUR	64	66,5

Нацбанк РБ	
1 USD	2037
1 EURO	2406
1 RUR	66,3

СПОРТИВНЫЕ ЗВЁЗДЫ

ПУСКАЙ МИР УЗНАЕТ НАШИХ



Василий Адамчик



Ирина Искрик

Четверо слонимских спортсменов в составе сборной нашей страны участвовали в матчевой встрече по легкой атлетике между командами России, Украины и Беларуси, которая проходила в Киеве. Слонимчане продемонстрировали достойные результаты. Ирина Искрик в прыжках в длину заняла второе место (6 м 02 см). Так же вторыми были Василий Адамчик в метании диска (55 м 75 см) и Татьяна Тимофейчик в метании молота (51 м 52 см).

Пятой пришла к финишу в беге на 200 метров Наталья Кацар.


Важным результатом прошедших соревнований стало то, что Ирина Искрик и Василий Адамчик выполнили квалификационный норматив для участия в чемпионате мира.

Валерий КОВАЛЕНКО

БИТВА ПОД ОСТРОЛЕНКО



И грянул бой на старинных улицах... *Продолжение темы на 28 стр.*



НАВІНЫ

ШАСЭЙНУЮ ВУЛІЦУ ЗАКРЫЮЦЬ НА РЭКАНСТРУКЦЫЮ

З другога чэрвеня ў Слоніме будзе перакрыта на некалькі месяцаў Шасэйная вуліца. Такое рашэнне прынята ў сувязі з яе рэканструкцыяй. Пра гэта карэспандэнту "ГС" паведамілі ў Слонімскім аддзяленні ДАІ.

Па гэтай прычыне на Шасэйнай вуліцы будзе спынены рух легкавога і грузавога транспарту. Магчыма, легкавы транспарт гэтую вуліцу будзе аб'язджаць праз цэнтр горада, а грузавы — праз мікраараён Энка. Плануецца, што Шасэйную вуліцу пашыраць на некалькі палосаў, зробяць камунікацыі для сцёку ліўнёвай вады і пакладуць якасны асфальт.

Сяргей ЧЫГРЫН

ВОПРОС-ОТВЕТ

КУДА ДЕВАЛСЯ ТВОРОГ?

Именно этот вопрос в последнее время стали часто задавать слонимчане, звонившие в редакцию "Газеты Слонімскай".

"На прилавках местных магазинов нет "нашего" недорогого творога, выпускаемого Слонимским заводом сухого обезжиренного молока, — пожаловалась слонимчанка Ирина Марчик. По её словам, продавцы говорят, что это все связано с тем, что предприятие присоединилось к волковысскому "Беллакту". Вопрос Ирины корреспондент «ГС» задала исполняющему обязанности директора завода Александру Красницкому.

Александр Георгиевич пояснил, что, действительно, пока что предприятие выпускает творог лишь одного вида — 10%-ой жирности. "Однако мы выполняем все заявки, поступающие к нам из магазинов. С 30 апреля этого года у нас на заводе идет реорганизация, так как передача прав правления заводом на год передана волковысскому "Беллакту". Специалисты выясняют, какая продукция пользуется спросом, и, в связи с этим, разрабатывается план выпуска товаров новых видов, более качественных и востребованных. В данный момент идет процесс преобразования кисломолочного цеха. И уже примерно в течение месяца завод увеличит выпуск новых видов продукции", — отметил Александр Красницкий.

По мнению Александра Георгиевича, отсутствие в продаже дешевого "слонимского" творога никак не связано с передачей прав правления Слонимского завода сухого обезжиренного молока волковысскому "Беллакту".

Ольга ШИНКЕВИЧ

МНЕНИЕ

ЗАПИСКИ ПРОВИНЦИАЛКИ

Ты построил свой тихий мирок, замуровал наглухо все выходы к свету, как делают термиты. Ты свернулся клубком, укрылся в своем обывательском благополучии, в косных привычках, в затхлом провинциальном укладе, ты воздвиг этот убогий оплот и спрятался от ветра, от морского прибоя и звезд. Ты не желаешь утруждать себя великими задачами, тебе и так немало труда стоило забыть, что ты – человек. Ты не житель планеты, несущейся в пространстве, ты не задаешься вопросами, на которые нет ответа: ты просто-напросто обыватель города С. Никто вовремя не схватил тебя и не удержал, а теперь уже слишком поздно. Глина, из которой ты слеплен, высохла и затвердела, и уже ничто на свете не сумеет пробудить в тебе уснувшего музыканта или поэта, или астронома, который, быть может, жил в тебе когда-то.

(К сожалению, уже не помню, кто автор этих строк...)


Фота Віталя ГІЛЯ

В ЭТОМ ГОРОДЕ НЕТ МЕСТА ОДИНОЧЕСТВУ...

Только начинаешь погружаться в свои мысли, как вдруг... "Здравствуйте, Олечка! Как вы?", — взгляд моей нежданной собеседницы, не дождавшись ответа на поставленный вопрос, оценивающе скользит по мне снизу вверх. Я, в свою очередь, делаю вид как-я-рада-вас-видеть и выдавливаю из себя: "Спасибо, все хорошо". Знакомую, видимо, очень сильно заинтересовал мой свитер, поэтому, не отводя от него глаз (чтобы потом рассказать своим подружкам, в чем я была одета), она продолжает разговор: "Замуж еще не вышли?" И, заранее зная мой отрицательный ответ (в этом городе про всех всё знают), она изрекает: "Пора уже". Я не вступаю в полемику со знакомой, решив сразу же перейти в наступление: "А как вы поживаете? Ваша дочь еще не вышла замуж? (уподобляюсь я истинной провинциалке, которую "интересует" чужое замужество)". Моя собеседница, наконец-то, отводит свой взгляд от моей одежды, и, глядя мне в глаза, тараторит: "Ей еще рано. Да и подходящей кандидатуры нет".

На этом мы расходимся, каждая по своим делам.

Подобные встречи у меня происходят N-ое количество раз в день. Набор вопросов, как, впрочем, и ответов, всегда одинаков.

"Про-вин-ция...", — констатируют мои друзья. Здесь свои законы, своя жизнь...

Все чаще меня раздражает чрезмерное внимание к моей персоне совершенно посторонних людей. Однако ничего с этим не поделать: в Слониме таков уклад жизни, когда "принято" знать многое о многих, передавая услышанное из уст в уста. Иногда ловлю себя на мысли, что и я стала слушать местные сплетни типа "а ты слышала, что у, допустим, Павла Павловича есть любовница, которая 10 лет была любовницей местного авторитета?" или "а вот этот пьет беспробудно и бьет свою жену и детей" и т.д.

За время проживания в этом городе (а я коренная слонимчанка) могу, не преувеличивая, сказать, что знаю в лицо почти половину города, а про остальную половину мне рассказывали...

Про-вин-ция...

ОТДЫХ В ПРОВИНЦИИ

"Где в Слониме можно отдохнуть?" — бесчисленное количество раз задавали себе этот вопрос многие. "А нигде", — прихожу к выводу, посетив почти все "известные" места в городе. На дискотеках — дети от 13 до 17 лет, причем, выглядят они намного старше моих 23-летних ровесников.

Меня шокируют красивые, молодые, ухоженные слонимчанки, с шикарными прическами, ругающиеся отборным матом и идущие за руку с "мужчинами" в спортивных костюмах. Не так давно, стоя вечером в очереди в магазине "Спутник" с такого рода публикой, была сражена наповал, когда миловидное создание говорило своему возлюбленному: "Дорогой, я думаю лучше взять две бутылки водки, чтобы потом не бегать из парка еще раз в магазин".

У каждого — свое представление об отдыхе. Раздражает повсеместно слышать впечатления о "хорошо проведенном вчерашнем дне". Развязка почти всегда одинаковая: "здорово отдохнули – пять бутылок водки на троих"...

Честно скажу, я бы, скорее всего, упала в обморок, услышав в понедельник с утра в автобусе: "Как замечательно мы отдохнули на выходных: сходили в театр, прогулялись по берегу Щары".

Про-вин-ция...

О ЗАВИСТИ

У нас, в провинции, особенно остро ощущается нелюбовь к приуспевающим, удачливым людям. "Спекулянты", "хапуги", "ворюги", "если бы не блат в исполкоме...", "наживаются на простых людях" — это все про них. И не дай Бог вам ездить в провинции на машине дороже 5000 долларов, жить в хорошем доме и иметь высокооплачиваемую работу. Ненависть (по крайней мере, соседей) вам обеспечена.

И никого не интересует, каким образом (порой, изнурительной многогодичной работой) достаются такие блага. У нас, в провинции, считают, что все более-менее богатые люди "имеют связь с мафией"...

А если у тебя есть мобильник... Один мой знакомый на несколько дней приехал к нам в Слоним из Витебска. Он рассказывал: "Я иду по вашему городу, и у меня зазвонил телефон. Ты бы видела лица прохожих, полные ненависти, когда я разговаривал...". "Преувеличивает", — подумала я. Однако потом вспоминала его слова, когда уже у меня в городском автобусе зазвонил мобильный. Действительно, зло смотрят. Хорошо, что не побили.

Про-вин-ция...

ДЕПРЕССИЯ

"Мухосранск", — так зло обзывают Слоним мои друзья. Каждый день — одно и тоже: работа – "Теремок" ("Оазис", "Местечко" и т.д., в зависимости от содержимого вашего кошелька) – дом... и опять работа. Да уж, скучновато. Однообразная жизнь приводит к затяжной депрессии... Плюс ко всему — постоянное отсутствие денег и жизнь в долг замучила большинство слонимчан. От этого у многих такие хмурые лица.

"И что я тут делаю? Это же болото", — "вечный" вопрос у многих моих знакомых, которые живут в Слониме. Тем не менее, у каждого есть ряд сдерживающих факторов, которые мешают им "вырваться из этого города". В основном, это отсутствие денег и боязнь что-либо поменять в своей размеренной, не очень приятной для них жизни в провинции.

На фоне всеобщей провинциальной депрессии все-таки выделяются люди, которые поражают меня своим оптимизмом и... желанием заниматься делом даже в таком Мухосранске, как Слоним.

Совсем недавно я познакомилась с Дим Димычем. Это — коренной слонимчанин, который, волей случая, стал гражданином Российской Федерации. Теперь, после долгих лет жизни в России, Дим Димыч вернулся в родной город. Он — удивительный человек. Представляете, не так давно он пошел на прием к нашему провинциальному мэру Мечиславу Костюку, чтобы поделиться своими предложениями, как сделать многие предприятия города прибыльными. "Я даже с Анатолием Фидриком (зам. председателя провинциального исполкома, курирующий отдел экономики) по этому поводу поругался. Он сказал, что мои идеи никому не нужны", — возмущается Дим Димыч с неподдельным непониманием, почему все-таки к нему не прислушались?

"А такие идеи замечательные были!" — даже не пытается скромничать Дим Димыч.

Вдруг он "переключается" на другое и предлагает мне "поиграть в прием у Путина" (для него сейчас это очень актуально, так как Дим Димыч собирается встретиться с президентом России, чтобы рассказать о своих проблемах).

"Вам никто не говорил, что вы – большой чудак?" — спрашиваю я. Дим Димыч улыбается: "Почему это?"

"Мне кажется, что попасть на прием к президенту России по своим вопросам — нереально", — говорю ему. "Глупости! Он же – всего лишь человек, а не Бог...", — возмущается моей "непонятливости" Дим Димыч. "Я сейчас планирую поехать в Америку, немного там поработать, может, даже открою свою фирму, а потом, по возвращению, обязательно схожу на прием к Путину", — делится планами Дим Димыч.

Откуда у человека столько энергии и сил? — думаю я. Слоним его еще не всего забрал.

Побольше бы таких чудаков в нашем городе, тогда бы в провинции жилось намного лучше.

О БЫВШИХ ПРОВИНЦИАЛАХ

Многие слонимчане, уезжающие учиться в областные центры или столицу, стараются приезжать в свой родной город раз два в месяц. "Нечего здесь делать", — мотивируют редкие появления дома мои знакомые. Всеми правдами и неправдами они будут стараться осесть "где-нибудь", только чтобы не вернуться в Слоним. В любом случае, они так и останутся про-вин-ци-алами, даже если на всю оставшуюся жизнь уедут в "большой" город.

Почему я до сих пор здесь? Честно скажу, не знаю. Многое меня раздражает в укладе нашего провинциального городка. Когда-то я, уподобившись "бывшим провинциалам", говорила своим минским друзьям: "Никогда не вернусь больше в Слоним!"

Однако судьба распорядилась иначе, отучив меня так категорично что-либо утверждать: и я снова живу и тружусь в провинциальном городке. Не отпускает меня Слоним...

Ольга ШИНКЕВИЧ

НАВІНЫ

НА ФЕСТЫВАЛЬ У ТОРУНЬ

Народны ансамбль народнай музыкі і песні "Грымата" у чацвер, 29 траўня, выедзе ў польскі горад Торунь.

Упершыню нашы землякі прымуць удзел у міжнародным фальклорным фестывалі, дзе ансамбль плануе выступіць паспяхова і заваяваць адно з прызавых месц.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПУСТЬ ЛЬЁТСЯ ПЕСНЯ

В Слонимским РДК прошёл концерт под название "И льётся песня", посвящённый всем тем, кто любит песни.

В концерте принимали участие ансамбли "Рябинушка", "Камелия", "Каскад" и другие коллективы. Вниманию зрителей было представлено много интересных песен и танцев.

Ольга ДЕМЕШЕВИЧ

ЗДАРЭННІ

ПЕРШАЯ АХВЯРА КУПАЛЬНАГА СЕЗОНУ

У нядзелю, 25 траўня, падчас купання на Шчары насупраць інтэрната медвучылішча патануў 36-гадовы мясцовы жыхар.

Па папярэдніх звестках, мужчына купаўся за сваім таварышам, які таксама знік пад вадой.

Як паведамілі карэспандэнту "ГС" работнікі Слонімскай выратавальнай станцыі, труп аднаго тапельца вадалазы знайшлі, а вось пошукі другога пэўных вынікаў не далі. Таму з упэўненасцю сцвярджаць, што ўтапіліся двое, пакуль ніхто не можа.

УКРАЛІ КАНЯ З ПАВОЗКАЙ

У ноч з 18 на 19 траўня ў вёсцы Загрыцькава Слонімскага раёна знікла гужавая павозка, а ў вёсцы Харашэвічы — конь у прыватнага гаспадара.

Хто запрог чужога каня ў крадзеную павозку, цяпер высвятляюць работнікі міліцыі.

НА МАТАЦЫКЛЕ ВЫЕХАЛІ З ХЛЯВА

25 траўня жыхар вёскі Урач выявіў, што ў яго з хлява прапаў матацыкл "Мінск", аб чым мужчына адразу паведаміў у міліцыю.

Пытаннем: хто і калі ўкраў матацыкал, цяпер займаецца міліцыя.

АЎТАМАБІЛІ БЕЗ НАГЛЯДУ

Пра гэта неаднойчы напаміналі работнікі праваахоўных органаў уладальнікам аўто.

Так на мінулым тыдні ноччу на праспекце Незалежнасці з аўтамабіля "Масквіч" укралі аўтамагнітолу.

Аналагічнае здарэнне адбылося і на вуліцы Брэсцкай, дзе злодзеі скралі магнітолу з "Фольсвагена-Транспарцёра".

Мікола КАНАНОВІЧ

НА ПАСАШОК

КУДЫ ПРЫВОДЗІЦЬ П'ЯНАЯ ДАРОГА?

Варыянтаў адказу на гэтае пытанне існуе вялікае мноства, з якіх, мабыць, самыя распаўсюджаныя — у турму, у бальнічную палату і на пагост.



Фота Віталя ГІЛЯ

Не сышоў з месца

Калі ж паглядзець на праблему татальнага п'янства ў нашым грамадстве з іншага боку, то яшчэ нядаўна класічным адказам на пастаўленае ў загалоўку пытанне было — у медвыцвярэзнік.

Цяпер выцвярэзнікаў няма. Закрыццё гэтай установы ў Слоніме мясцовых п'яніц зусім не засмуціла, але асабліва і не парадавала.

Тыя, хто перабраў спіртнога настолькі, што ногі не могуць давесці дамоў, доўга на вуліцы не застаюцца. Толькі замест выцвярэзніка цяпер іх дастаўляюць у аддзел міліцыі альбо ў бальніцу. Аднак у любым выпадку, як гэта было і раней, найперш п'янаму даводзіцца кантактаваць з міліцыянерамі.

Адным сваім выглядам п'яны абражае чалавечую годнасць і мараль, калі знаходзіцца ў грамадскім месцы. Ва ўсякім разе так запісана ў заканадаўстве. І за гэта прадугледжана адміністратыўная адказнасць. Работнікі міліцыі забіраюць з вуліцы чалавека, які з цяжкасцю трымаецца на нагах і сваім выглядам можа абражаць чалавечую годнасць цвярозых, нават калі пры гэтым ніякіх правапарушэнняў ён не ўчыніў. Раней такіх везлі ў медвыцвярэзнік. Там работнікі міліцыі складалі на п'яных пратаколы, а кваліфікаваны фельчар займаўся іх ацвярэзеннем. Назаўтра кліент расплачваўся за паслугі ўстановы і за з'яўленне ў п'яным выглядзе ў грамадскім месцы. Калі іншых парушэнняў не было, то на тым справа і канчалася. Калі ж з боку п'янага мела месца хуліганства, непадпарадкаванне работнікам міліцыі ці іншыя правапарушэнні, то тады ўжо суд вызначаў (і вызначае зараз) меру адміністрацыйнага пакарання — большую суму штрафу альбо арышт ад трох да пятнаццаці сутак. Цяпер п'яных таксама абслугоўваюць міліцыянеры з медыкамі, але кожная служба паасобку.

Калі нарад міліцыі знаходзіць на вуліцы чалавека ў моцнай ступені ап'янення, выклікаецца "хуткая дапамога". Медыкі робяць сваю справу на месцы альбо вязуць п'янага ў райбальніцу. Як зазначыў галоўны ўрач Слонімскага ТМА Юрый Пяцельскі, з пачатку года ў рэанімацыйным аддзяленні райбальніцы пабывала нямала пацыентаў з дыягназам "алкагольнае атручванне". Такім людзям аказваецца неадкладная медыцынская дапамога на агульных падставах, як і ўсім іншым.

П'яных, якім дапамога медыкаў не патрабуецца, могуць даставіць дамоў альбо пакінуць цверазець у аддзеле міліцыі. За сам факт з'ўлення ў грамадскім месцы ў п'яным стане прадугледжана пакаранне штрафам у адну мінімальную зарплату. Па словах начальніка аддзела грамадскай бяспекі і прафілактыкі Слонімскага РАУС Мікалая Саўчыца, найбольш часта людзі ў стане лёгкага ап'янення трапляюць у міліцыю за хуліганства і парушэнне грамадскага парадку. У мясцовы райсуд амаль штораніцы прывозяць учарашніх п'яных дэбашыраў, якія пасля рашэння суддзі папаўняюць кантынгент так званых сутачнікаў.

З надыходам вясны і лета на слонімскіх вуліцах і ў парках, асабліва па вечарах, п'яныя з'яўляюцца, як грыбы пасля дажджу. І хоць медвыцвярэзнік даўно зачынены, міліцыянерам і дактарам працы з імі хапае. А чым кліентам — міліцыі ці медыкаў — стане чарговы аматар Бахуса, залежыць ад індывідуальных здольнасцяў у гэтай справе кожнага і колькасці выпітага "на пасашок" перад тым, як пайсці дахаты.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННЕ

ЗЛОДЗЕЙ ПАЕХАЎ ДАЛЕЙ

У першай палове дня 23 траўня ў рэдакцыю "ГС" патэлефанавала сланімчанка Святлана Іванаўна і расказала, як яна стала ахвярай кішэннага злодзея ў гарадскім маршрутным аўтобусе №12.

Жанчына ехала на працу, калі ў цэнтры горада заўважыла, што з сумачкі знік кашалёк з грашыма. У крадзяжы Святлана Іванаўна адразу западозрыла маладога чалавека цыганскай нацыянальнасці, які знаходзіўся побач. Таму на прыпынку "Універмаг" яна выйшла з аўтобуса і звярнулася па дапамогу да работнікаў міліцыі. Дзяжурны правёў пацярпелую ў аддзел крымінальнага вышуку, але аказалася, што пусціцца наўздагон за аўтобусам на аўтамабілі міліцыянеры не могуць — няма бензіну.

На ўсякі выпадак супрацоўнік крымінальнага вышуку разам з пацярпелай пачакалі, пакуль аўтобус будзе вяртацца назад на прыпынку "Аптэка", але западозранага Святланай Іванаўнай у крадзяжы кашалька маладога чалавека ў салоне ўжо не было. Той факт, што работнікі міліцыі не маглі з-за адсутнасці бензіну злавіць злодзея за руку па гарачых слядах, вельмі ўсхвалявау жанчыну.

Як патлумачылі карэспандэнту "ГС" у аддзеле крымінальнага вышуку, зараз работнікі слонімскай міліцыі адчуваюць вялікія цяжкасці з палівам для аўтатранспарту. Райаддзел міліцыі завінаваціўся прадпрыемству нафтапрадуктаў вялікую суму. І пакуль грошы на пагашэнне запазычанасці з бюджэту не паступяць, міліцэйскія машыны застаюцца без паліва. Тым часам "кішэннік" спакойна з'ехаў на гарадскім аўтобусе проста з-пад носа ў міліцыі.

Святлана Іванаўна напісала заяву ў міліцыю аб крадзяжы яе кашалька, і цяпер ёй толькі застаецца чакаць, што аператыўнікі ўсё ж нейкім чынам выйдуць на злодзея.

У сваю чаргу, работнікі крымінальнага вышуку заклікаюць жанчын — патэнцыяльных ахвяр кішэнных злодзеяў — быць больш пільнымі пры кантактах з падазронымі асобамі.

Паколькі не злоўлены за руку — яшчэ не злодзей, і ўлічыць чалавека ў такім злачынстве досыць складана.

Аналагічны выпадак адбыўся на мінулым тыдні і на слонімскім рынку, дзе злодзей выцягнуў кашалёк з сумачкі жанчыны. У крадзяжы таксама падазраецца асоба цыганскай нацыянальнасці.

Мікола КАНАНОВІЧ

ФЕМІДА

ЗА КВАТЭРУ НЕ ПЛАЦЯЦЬ ПРАЦАЗДОЛЬНЫЯ

Як стала вядома карэспандэнту "ГС", на пачатку тыдня на разглядзе ў Слонімскім райсудзе знаходзілася каля сотні адміністрацыйных спраў у дачыненні тых людзей, хто не плаціць за камунальныя паслугі.

Цікава, што абсалютная большасць неплацельшчыкаў — людзі працаздольнага ўзросту. Пенсіянеры за кватэру плацяць, як правіла, спраўна з месяца ў месяц.

Пасля таго як суддзя прымае рашэнне аб спагнанні з даўжнікоў запазычанасці ў прымусовым парадку, судовыя выканаўцы ходзяць па кватэрах неплацельшчыкаў і перапісваюць маёмасць. Аднак на практыцы вельмі часта атрымліваецца так, што перапісваць у тых людзей і няма чаго.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННЕ

ЖАНЧЫНА ПАДАЗРАЕ ПАЛЮБОЎНІКА

На мінулым тыдні з заявай у міліцыю звярнулася сланімчанка С., якая жыве на Энцы.

Жанчына сцвярджае, што на працягу доўгага часу з кватэры знікалі яе асабістыя рэчы. Гэта адбывалася пасля таго, як яе кватэру пакідаў сябар, з якім у яе былі інтымныя адносіны.

Па фактах, выкладзеных у заяве, міліцыя праводзіць праверку.

Мікола КАНАНОВІЧ

ІНТЭРВ'Ю

Аляксандр ЗВЯРОВІЧ: "Я ЗНАЙШОЎ СЯБЕ Ў ПЕСНІ"

Лаўрэата многіх міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, эстраднага спевака са Слоніма Аляксандра Звяровіча вельмі рэдка можна застаць у родным горадзе. Карэспандэнт "ГС" з ім сустрэўся ў Гродне падчас справаздачнага канцэрта Слонімскага раёна перад вобласцю, дзе і адбылася гутарка.



Фота Віталя ГІЛЯ

Спявае Аляксандр Звяровіч

— Аляксандр, слонімцам будзе цікава даведацца, як сёння складваецца твой творчы лёс?

— Нядаўна я выйграў конкурс на ўдзел у фестывалі беларускай песні і паэзіі ў Маладзечна, які адбудзецца летам. Дзесятага чэрвеня еду ў Маскву на міжнародны конкурс маладых выканаўцаў джазавай песні. Так атрымалася, што я паспрабаваў выконваць джазавыя творы, і яны сталі атрымлівацца. Таму мяне і запрасілі на гэты конкурс. Ёсць запрашэнні на эстрадныя фестывалі ў Польшчу і ў Прыбалтыку. Падтрымліваю творчыя кантакты з многімя вядомымі артыстамі эстрады, вучуся ў іх, шмат слухаю песень, гляджу відэазапісы. За гэты час я добра зразумеў, што знайшоў сябе і займаюся тым, чым магу і што люблю. І мая справа некаму ўсё ж патрэбна. А гэта самае галоўнае.

— Амаль год ты не выступаў разам са сваімі землякамі. Ці спадабаўся табе канцэрт у Гродне?

— Справа ў тым, што ўсе сцэнічныя нумары слонімскіх артыстаў я бачыў раней. Лічу, што гэта адно з лепшых нашых шоу. Праграма была вельмі разнастайная, эмацыянальная, шмат прыгожых касцюмаў, арганізацыя прадумана да дробязей. Мяркую, што пасля Слоніма ў Гродна будуць баяцца ехаць выступаць іншыя раёны вобласці. А калі шчыра казаць, я не сумняваўся, што мы выступім добра. Слонім — адзін з мацнейшых гарадоў Беларусі, дзе працуюць вельмі здольныя педагогі па музыцы, падрастае таленавітая моладзь, якая мае здольнасці да музыкі і песень, да мастацтва і літаратуры.

— Аляксандр, калі мы ўжо ўбачым твой персанальны канцэрт на сцэне Слонімскага РДК?

— Не быў я ў Слоніме ўжо даўно. Няма часу. Зараз я працую над новаю сольнаю праграмаю — гэта будзе вечар цыганскага рускага раманса "Струны сэрца". Плануюю восенню з гэтаю праграмаю прыехаць і выступіць у Слоніме. Гэта будзе жывы гук з фартэпіяна, скрыпкаю, гітараю, віяланчэллю. У запланаваным канцэрце паспрабую раскрыць раманс з другога пункту гледжання. Таму што ўсе прывыклі, што цыганскія рамансы — гэта грудны голас, дзе ўсё трасецца і г.д. Мне хочацца падаць цыганскі раманс зусім інакш, у выкананні больш чыстым, духоўным і светлым. Адначасова рыхтуецца і мая новая эстрадная праграма. У ёй таксама будуць прымаць удзел харэаграфічны калектыў "Тат", а таксама вакальная група пад кіраўніцтвам Ірыны Грахоўскай. З эстраднаю праграмаю плануюю завітаць у родны горад дзесьці ў канцы жніўня.

— Рэспубліканская прэса пісала аб тым, што ты пазнаёміўся з кіраўніком цыганскага ансамбля "Рамэн" Мікалаем Слічэнкам і ў вас склаліся добрыя сяброўскія і творчыя ўзаемаадносіны. Ці праўда?

— Было-было такое. Справа ў тым, што мяне, сапраўды, запрашалі працаваць у цыганскі ансамбль "Рамэн". Але на дадзены момант мяне гэтае запрашэнне не цікавіць. Там трэба пачынаць усё з пачатку, як кажуць, з масоўкі. А гэта навошта мне патрэбна. У мяне і ў Беларусі ёсць шмат працы і спраў. Тым больш, што я ўжо прайшоў усе цяжкасці, усе эстрадныя выпрабаванні ад пачаткоўца да пераможцы розных конкурсаў. І стаяць у масоўцы "Рамэна" дзеля віду мне не хочацца. А тут я вольны птах з новымі ідэямі і планамі. Але я паранейшаму падтрымліваю добрыя адносіны з гэтым калектывам, з яго кіраўніком Мікалаем Слічэнкам. Маю нават некалькі аднаразовых запрашэнняў на сумесныя канцэрты. А нядаўна я запісаў разам з "Рамэнам" некалькі цыганскіх песень, якія ўвайдуць у зборку, якая называецца "Цыган Савецкага Саюза".

— Тым не менш, цыган па нацыянальнасці не павінен абмяжоўвацца і выконваць толькі цыганскія песні...

— І я так лічу. Бо адчуваю, што мне бліжэй еўрапейская музыка, я выхаваны еўрапейскаю культураю. І я, на жаль, далёка не цыганскі выканаўца і артыст з Усходу. Я — беларускі эстрадны спявак. І беларуская мова для мяне бліжэйшая і больш зразумелая, чым цыганская.

— І апошняе пытанне, Аляксандр. Розныя чуткі хадзілі па Слоніму наконт твайго здароўя. Як ты сябе адчуваеш сёння?

— У свой час у мяне, на самой справе, былі праблемы з галасам, найперш з галасавымі звязкамі. У мяне "ломка" голасу пачалася ў 22 гады. Але гэта справа даўно мінулых дзён. І цяпер я сябе адчуваю выдатна і песнямі радую людзей.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

ЛЮБІМ І КАХАЕМ ПА-БЕЛАРУСКУ

У лютым Таварыства беларускай мовы правяло рэспубліканскі месячнік "Любім і кахаем па-беларуску", у межах якога праходзіў конкурс "Як мы пазнаёміліся".

Па ўмовах конкурсу патрэбна было падрыхтаваць аповед пра тое, як пазнаёмілася пара маладых людзей ва ўзросце да 25 гадоў. Знаёмства павінна было адбыцца на беларускай мове. Апошнім часам з беларускай гутарковай лексікі кахання знікаюць нават такія словы як любы, красуня, князёўна і многія іншыя, якімі ў свой час карысталіся нашы бацькі і дзяды. Узнавіць іх у памяці маладых і было адной з мэтаў конкурсу.

Свае аповяды на конкурс даслалі закаханыя з Клімавіч, Маладзечна, Вілейкі, Слоніма і іншых гарадоў і мястэчак Беларусі. І вельмі прыемна, што пераможцамі конкурсу сталі Яніна Мельнікава і Максім Маслаў са Слоніма. Яны расказалі пра сваё знаёмства ў кантэксце гістарычнага мінулага і сталі пераможцамі. Яніна вучыцца на 5 курсе факультэта журналістыкі БДУ і працуе педагогам у цэнтры "Давер", Максім — студэнт гістфака педуніверсітэта. Ініцыятарам прыняць удзел у конкурсе "Як мы пазнаёміліся" была Яніна. Дзяўчына ўбачыла абвестку пра конкурс у "Газеце Слонімскай" і прапанавала Максіму разам напісаць аповед. Узнагарода за перамогу — пуцёўка на адпачынак на дваіх у санаторый "Нарач".

У конкурсе таксама прымалі ўдзел муж і жонка Аляксей і Наталля Высоцкія са Слоніма. Яны занялі пятае месца.

Віншуем!

Таццяна ТРАФІМЧЫК

ІНТЭРВ'Ю

Уладзімір ЛАМЕКА: "ЗА МЕЖАМІ НАШАЙ КРАІНЫ ПРАЖЫВАЕ КАЛЯ ТРОХ З ПАЛОВАЮ МІЛЬЁНАЎ БЕЛАРУСАЎ"

Нядаўна па сваіх службовых абавязках Слонім наведаў намеснік старшыні Камітэта па справах рэлігіі і нацыянальнасцей Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь наш зямляк Уладзімір Ламека. Уладзімір Барысавіч пагадзіўся адказаць на некалькі пытанняў нашага карэспандэнта.

— Уладзімір Барысавіч, чым займаецца ваш Камітэт?

— У полі зроку нашага камітэта (а гэта ўсяго дванаццаць чалавек) справы ўсіх рэлігійных канфесій Беларусі, праблемы нацыянальных супольнасцяў, якія пражываюць на нашай тэрыторыі, а таксама ўсёй беларускай дыяспары замежжа, якая сёння налічвае каля трох з паловаю мільёнаў чалавек.

— Як вы пракаменціруеце змены ў Законе Рэспублікі Беларусь "Аб плацяжах за зямлю" для рэлігійных арганізацый, дзе гаворыцца аб тым, што "землі, прадастаўленыя ва ўласнасць, карыстанне ці ва ўласнасць рэлігійных арганізацый, а таксама выдзеленыя пад будаўніцтва рэлігійных будынкаў і збудаванняў, належаць падаткаабкладанню зямельным падаткам у агульнаўстаноўленым парадку па стаўках, якія ўстаноўлены заканадаўствам"? А раней былі ж льготы па зямельнаму падатку для рэлігійных арганізацый.

— Гэтае пытанне цяпер вырашаецца, і яно будзе знаходзіцца ў кампетэнцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Мы прасілі кожную вобласць, каб яно было разгледжана менавіта на сесіях Саветаў станоўча: зняць каэфіцыент і па абсалютнаму мінімуму гэтыя падаткі ўлічыць для канфесій. Вядома, гэта няправільна, што для рэлігійных канфесій такімі высокімі атрымаліся падаткі.

— Вы ў Слонім прыехалі на рэспубліканскі семінар. Якія пытанні на ім разглядаліся? І чаму гэты семінар адбываецца менавіта ў Слоніме?

— Семінар быў прысвечаны праблемам нашай духоўнасці, вырашэнню супольных праблем дзяржаўных структур з рэлігійнымі вядучымі канфесіямі на Беларусі, найперш з праваслаўнаю і каталіцкаю, а таксама з тымі, якія вызначаны ў прэамбуле нашага Закона — гэта іслам, юдаізм і г.д. На тэрыторыі Слонімскага раёна знаходзіцца адна з беларускіх святынь — Жыровіцкая Свята-Успенская абіцель. Таму праводзіць падобныя семінары на Гродзеншчыне стала традыцыяй. У мінулым годзе ў Астраўцы прайшоў цікавы семінар, дзе разглядаліся праблемы нацыянальных супольнасцяў. Наогул, сёння трэба нам духоўна адраджацца, ратаваць нашы душы.

— Уладзімір Барысавіч, здаецца, вы дзесьці родам з нашых мясцін?

— Родам я з Зэльвешчыны з вёскі Вострава. Закончыў у свой час Галынкаўскую сярэднюю школу. Але на Слонімшчыне сёння пражываюць амаль усе мае сваякі: два браты і сястра, тут жыла мая бабуля. І, наогул, Слонімшчына — гэта мая маленькая радзіма, якая заўсёды мне наталяе.

— Ці часта бываеце на сваёй маленькай радзіме?

— Па меры магчымасці стараюся бываць. Вось сёння я начаваў у сваіх родных.

— Вы некалі займаліся філалагічнай навукаю. Цяпер ужо, відаць, не?

— Гэтую справу я не пакідаю. Ёсць у мяне набыткі ў гэтым плане, ёсць шэраг публікацый, займаюся перакладамі, нядаўна пераклаў на беларускую мову аповесць Рамэна Ралана " Кала Бруньён", дзе атрымаў найвялікшую асалоду. Гэты твор наколькі вельмі цікавы, настолькі ён хараша пакладзены на нашу родную стыхію.

Сяргей ЧЫГРЫН

ГОДОВЩИНА ВОЕННОГО ОБЪЕКТА

20 мая исполнилось 55 лет со дня образования Чепелёвского полигона. В связи с этим в прошедшую пятницу состоялось торжественное мероприятие.

Именно в этот день 1948 года возле деревни Чепелево была отведена земельная площадь под полигон. Этот день и принято считать днём образования военного объекта.

Сейчас на военном объекте проходят обучение все военнослужащие бригады. По словам заместителя начальника полигона Андрея Черненко, в 50-х годах прошлого столетия местный археолог Василий Супрун в районе Чепелёво обнаружил стоянку древних людей. На том месте было обнаружено много наконечников стрел, чем доказано, что человек здесь жил и воевал ещё две тысячи лет до нашей эры.

От командования и от механизированной бригады ряду военнослужащих были вручены ценные подарки.

Ценные подарки от фирмы «Телкон» начальнику полигона и его заместителю вручил Геннадий Бабошкин.

Но самый дорогой сюрприз в этот день начальнику полигона Юрию Севостьяну подарила жена, она родила ему дочь.

Александр ЗАХАРЕНКО

ГРОДНО

ГОРЕЛА МЕБЕЛЬНАЯ ФАБРИКА

Сильный пожар возник ночью 22 мая в арендованном одной из местных частных фирм здании мебельной фабрики в Гродно.

Как сообщила БелаПАН пресс-служба МЧС, возгорание на территории мебельной фабрики удалось обнаружить лишь в первом часу ночи, сообщение о пожаре поступило в половине первого.

К прибытию спасателей одноэтажное здание, под крышей которого располагались цех по производству мебели и склад готовой продукции, горело открытым пламенем.

Кирпичное строение тушили 9 пожарных аварийно-спасательных подразделений. Спасателям удалось быстро локализовать огонь, однако спасти здание и находящееся внутри оборудование и продукцию не удалось.

Пожар ликвидировали к половине третьего ночи, однако до утра спасатели поливали обгоревшие фрагменты здания и остатки мебели, разбирали рухнувшие конструкции.

Дмитрий БЕЛЬСКИЙ

НАШЛИ СНАРЯДЫ

Несколько снарядов времен Второй мировой войны были найдены 22 мая в Гродно в ходе строительных работ.

Снаряды нашли рабочие на территории строительства автозаправочной станции в городском микрорайоне Вишневец.

Как сообщил БелаПАН сотрудник пресс-службы управления по чрезвычайным ситуациям Гродненского облисполкома Александр Суворов, сейчас саперы проводят необходимые работы по разминированию снарядов.

Иван ПАВЛЁНОК, БелаПАН

ЗЭЛЬВА

НОВАЯ СТАНЦИЯ

В Зельвенском районном узле электросвязи (РУЭС) начались работы по введению в эксплуатацию новой АТС на базе оборудования.

Как сообщил корреспонденту "ГС" главный инженер Зельвенского РУЭС Игорь Атарик, с введением нового оборудования увеличится количество исходящих и входящих каналов.

Абоненты третей тысячи (номера 2-30-00...2-39-99) переключены на новое оборудование, что дает возможность пользоваться рядом дополнительных видов обслуживания.

Так 800 абонентов Зельвы и деревни Деречин могут воспользоваться такими новыми услугами, как тоновый набор, переадресация на другой номер в случае "занято" и другие виды обслуживания.

На начало текущего года на очереди на установку телефона стояло 230 человек. По словам Игоря Евгеньевича, с введением в эксплуатацию нового оборудования запросы по телефонизации будут удовлетворены.

Наталья ГЛУШЕНЯ

ГРОДНА



Фота Віталя ГІЛЯ

На Савецкай плошчы ў цэнтры горада

СМИ

БЕЛОРУССКИЕ ЖУРНАЛИСТЫ ПОЛУЧИЛИ НАГРАДЫ

В Гамбурге белорусские журналисты получили награды немецкого фонда "Zeit", предназначенные для молодой прессы Восточной Европы.

Лауреатами этого года стали газета "Белорусский рынок" (Минск), "Свободный курс" (Барнаул), "Экспресс" (Львов). Каждый лауреат награжден суммой в 40 тысяч евро как независимые высококачественные медиа, способствующие своей деятельностью укреплению свободы слова.

Специальным призом в 10 тысяч евро за мужество был награжден редактор закрытой властями гродненской газеты "Пагоня" Николай Маркевич.

"Мы хотим выразить наградой не только наше признание хорошей журналистской работы, — сказал на церемонии вручения профессор Манфред Ланштайн, председатель попечительского совета фонда. — Мы хотим подчеркнуть, какую роль она выполняет в развитии средств массовой информации, в защите независимой прессы от произвольного вмешательства и превышения власти государственных учреждений".

Николай Маркевич не смог присутствовать на вручении приза, так как до окончания срока его осуждения — то есть, до марта 2004 года — ему запрещен выезд из Беларуси. Диплом лауреата приза "Zeit" в Гамбурге получала его супруга, Ольга Маркевич.

"Я расцениваю эту награду как знак солидарности с "Пагоняй", десятками мужественных людей, профессиональных журналистов, которые и являются "Пагоняй", — сказал в интервью БелаПАН Николай Маркевич. — Это недвусмысленный сигнал душителям свободы слова на Беларуси".

По его словам, приз в денежном выражении будет сохраняться на счетах фонда "Zeit" до тех пор, пока белорусское налоговое законодательство не позволит ввезти его в страну без взимания слишком высоких налогов. Приз будет потрачен "на журналистскую деятельность", сказал Маркевич.

Ирина ЧЕРНЯВКА

ГРОДНО

ИЗБРАН НОВЫЙ СЕКРЕТАРЬ ОРГАНИЗАЦИИ СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ

Новым секретарем гродненского отделения Союза белорусских писателей избран поэт и журналист Юрка Голуб.

Такое решение приняло отчетно-выборное собрание организации. Юрка Голуб сменил на этом посту поэтессу Дануту Бичель, которая по собственной инициативе сняла с себя обязанности секретаря.

Выступая перед собранием организации, Юрка Голуб заявил, что в своей деятельности будет опираться "на помощь областной исполнительной власти". Он выступил за создание из числа писателей отделения Бюро пропаганды: "Наша задача – работать со своим читателем, писать книги, а здесь мы сидим в огромной яме. Мы должны, как в советские времена, выступать с произведениями в коллективах".

На собрании писатели критически отзывались о деятельности своей организации.

Один из участников собрания назвал отделение "глухой провинцией, о которой все забыли", а ситуацию, сложившуюся в писательской среде города, "хуже, чем ноль".

Юрка Голуб родился в 1947 году. Поэт, автор около 10 книг поэзии. Сегодня работает в газете "Гродненская правда".

Иван ПАВЛЁНОК

ГРОДНО

ДЕЯТЕЛИ КУЛЬТУРЫ И НАУКИ ОБРАТИЛИСЬ К ВЛАСТЯМ

Деятели культуры и науки Гродно требуют от горисполкома открытия мемориальных досок в честь Кастуся Калиновского и повстанцев 1863—1864 годов.

22 мая письмо с почти 20 подписями преподавателей Гродненского государственного университета, историков, краеведов, художников было направлено на имя председателя Гродненского горисполкома Александра Антоненко. Также это обращение граждан получил депутат городского Совета Сергей Антусевич, который намерен озвучить его на сессии. В письме граждане требуют "достойного чествования 140-й годовщины восстания 1863—1864 годов и открытия мемориальных досок в памятных местах Гродно". Напоминается, что решение о чествовании памятных мест, связанных с восстанием 1863—1864 годов, было принято Гродненским горисполкомом еще в 1993 году.

"Мы считаем необходимым выразить глубокое уважение этому великому событию и отдать долг тем, кто сражался за волю и независимость Беларуси", — отметил в беседе с корреспондентом БелаПАН один из подписантов письма историк Владимир Хильманович.

Авторы обращения предлагают городским властям адреса, где, по их мнению, должны быть установлены памятные доски. Это дом по улице Советской, 7 – единственное, говорится в письме, место, связанное с жизнью Кастуся Калиновского, которое сохранила история. Авторы письма предлагают также открыть мемориальную доску на доме №21 по улице Советской.

На сегодняшний день в Гродно существует мемориальная доска в честь повстанцев 1863—1864 годов, установленная в начале 90-х годов на здании железнодорожного вокзала.

Иван ПАВЛЁНОК

ДЗЯТЛАВА

ЯВІЎСЯ І ПАВІНІЎСЯ

Амаль паўгода спатрэбілася жыхару Мінска, каб крытычна ацаніць свае дзеянні і пакаяцца.

Яшчэ на пачатку гэтага года ён абакраў ларок, што знаходзіцца на аўтастанцыі ў пасёлку Наваельня Дзятлаўскага раёна. Нядаўна мужчына з'явіўся ў міліцыю і прызнаўся ў злачынстве.

ПАМЁР ПРАМА ЗА РУЛЁМ

Жыхара вёскі Раготна Дзятлаўскага раёна смерць напаткала ў кабіне трактара МТЗ-80.

У той дзень ён працаваў згодна нарада ў мясцовай гаспадарцы.

КРАДЗЁЖ НЕ ЎДАЎСЯ

У дзятлаўскую міліцыю звярнулася загадчыца магазіна вёскі Труханавічы.

Яна паведаміла, што нехта разбіў у магазіне акно і спрабаваў украсці нагледжаныя тавары, але вынесці іх не змог.

Відаць, злодзея нехта моцна напалохаў, і ён уцёк. Тавар валяўся на падлозе каля акна.

САМА СЯБЕ ПАДМАНУЛА

Жыхарка В. з Дзятлаўскага раёна паведаміла ў міліцыю, што ў яе ўкралі 400 долараў ЗША і 20 тысяч беларускіх рублёў.

Як высветлілася ў ходзе следства, грошай ніхто не краў, проста жанчына іх згубіла, але баялася, каб муж не сварыўся, і таму сама інсцэніравала крадзёж.

Цяпер у адносінах да яе ўзбуджаны дзве крымінальныя справы: за падманны данос і падманныя справы. Грамадзянку чакае суд.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ЗЭЛЬВА

ТОКАМ ЗАБІЛА КАРОЎ

Нядаўна пры выгане на пашу з фермы калгаса імя Леніна ў вёсцы Мадзейкі Зэльвенскага раёна смяротна былі траўміраваны токам чатыры каровы.

А здарылася гэта пасля таго, як калгасныя рагулі зачапілі абарваны з апоры электраперадач дрот, які ляжаў на зямлі.

Мікола КАНАНОВІЧ

ГАРЭЎ ХЛЕЎ

На вуліцы 40 год Перамогі, што ў Зэльве, у мінулую суботу, 24 мая, здарыўся пажар.

Як паведамілі карэспандэнту "ГС" у раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях, у выніку пажару быў пашкоджаны дах і столь хлява.

ЖАНЧЫНА ЗАГІНУЛА Ў АГНІ

На днях у вёсцы Конна Зэльвенскага раёна загарэўся жылы дом.

У агні загінула 33-гадовая гаспадыня, якая стаяла на ўліку ў псіха-неўралагічным дыспансеры. Прычыны ўзгарання высвятляюцца.

Наталля ГЛУШЭНЯ

ГРОДНО

ДЕСЯТИ ОДАРЕННЫМ ШКОЛЬНИКАМ ВРУЧЕНЫ СТИПЕНДИИ

Председатель Гродненского горисполкома Александр Антоненко вручил десяти одаренным школьникам единовременные стипендии в размере 20 базовых величин.

Награждались ученики, проявившие в последние годы выдающиеся успехи в учебе и общественной жизни.

Среди стипендиатов — призер республиканской математической олимпиады 2001 и 2002 годов, член-корреспондент физико-технической академии Московского физико-технического института, ученик 11 класса гродненского лицея № 1 Евгений Микулич; призер республиканских олимпиад по химии 2002-2003 годов, ученик 10 класса гродненской гимназии №1 Сергей Батура; победительница республиканской олимпиады по русскому языку, ученица 11 класса СШ №15 Оксана Николаенко.

"Вручая эту стипендию, мы показываем детям, что в нашем обществе и интеллектуальные достижения что-то значат", — так прокомментировала БелаПАН заместитель начальника управления образования горисполкома Елена Крыжановская.

Ирина ЧЕРНЯВКА

МАСТЫ

НЕЗВЫЧАЙНАЯ З'ЯВА

Сёлетняя вясна з яе дажджлівым надвор'ем у траўні прыемна здзівіла аматараў грыбоў.

І гэта датычыць не толькі першых веснавых смарчкоў ды страчкоў.

У другой палове траўня жыхары Галубоўскага, Курылавіцкага, Азёркаўскага і некаторых іншых сельсаветаў нечакана для сябе пачалі знаходзіць у лесе падасінавікі, падбярозавікі ды маслякі. Некаторыя аматары змаглі за гадзіну-другую назбіраць па кошыку грыбоў.

У БРЭСЦЕ ЗМАГАЛІСЯ ДАСТОЙНА

Адбыліся чарговыя рэспубліканскія спаборніцтвы дапрызыўнай і прызыўнай моладзі пад назвай "Абаронім Айчыну".

Сёлета яны праходзілі ў Брэсце.

У склад каманды Гродзенскай вобласці ўваходзілі прадстаўнікі Мастоўскага, Гродзенскага раёнаў і Кастрычніцкага раёна горада Гродна.

Каманду да спартакіяды рыхтаваў выкладчык пачатковай ваеннай падрыхтоўкі мастоўскай СШ № 5 Анатоль Місюк сумесна з Анатолем Чулаковым з Гродзенскага раёна.

Спаборніцтвы праходзілі па наступных відах: бег 100 і 300 метраў, падцягванне, стральба, плаванне, кіданне гранаты.

Па выніках каманда Гродзенскай вобласці заняла другое месца.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ГРОДНО

В ШКОЛАХ И ДЕТСКИХ САДАХ ОБЪЯВЛЕН КАРАНТИН



Фота з архіва IREX/ProMedia

Уже 40 заболевших серозным менингитом зарегистрировано в Гродно. Предполагаемый источник заражения — водопроводная вода.

Случаи заболевания серозным менингитом зарегистрированы в областном центре за три недели мая. Большинство заболевших — дети и подростки до 14 лет, проживающие на улицах Лиможа, Брикеля и бульваре Ленинского комсомола. Как сообщила БелаПАН заведующая эпидотделом Гродненского городского Центра гигиены и эпидемиологии (ЦГиЭ) Светлана Павлова, заболевание протекает в легкой и средней формах тяжести, а госпитализация длится, как правило, не более трех дней.

Серозный менингит — воспаление мягких мозговых оболочек. Его возбудителем является энтеровирус, который может находиться в различной среде и передаваться водным, пищевым и воздушно-капельным путями.

"Мы предполагаем, что источник заражения — водопроводная вода, — сказала Светлана Павлова. — Но на каком этапе, где происходит заражение, нам еще неизвестно".

Пока же врачи рекомендуют горожанам не употреблять некипяченую водопроводную воду. В ближайшие 10 дней на всех водозаборах города будет произведено гиперхлорирование, в связи с чем водопроводная вода будет иметь сильный запах хлора.

Эта вода также будет вредна для здоровья. Но, как заявила С.Павлова, "из двух зол мы выбираем меньшее; другими средствами дезинфекции мы не владеем".

Среди симптомов заболевания — резкое повышение температуры, головная боль, изредка рвота. Поскольку в Гродно заболевание появилось на фоне распространения гриппозных и острых респираторных инфекций, диагностировать менингит сложно.

По словам Павловой, в городе проводятся все необходимые противоэпидемиологические мероприятия. В школах и детских садах объявлен двухнедельный карантин. ЦГиЭ ставит вопрос перед горисполкомом о приобретении для школ одноразовой посуды и бутилированной воды.

Ирина ЧЕРНЯВКА

ГРОДНО

БУДУТ СУДИТЬ ИНСПЕКТОРА МЕДУНИВЕРСИТЕТА

Передано в суд уголовное дело против инспектора студенческого отдела кадров Гродненского медицинского университета. В деле применена программа защиты свидетелей.

От трех до семи лет лишения свободы грозит женщине-инспектору студенческого отдела кадров Гродненского государственного медицинского университета. Ей предъявлены обвинения по статьям уголовного кодекса "Подстрекательство к даче взятки" и "Мошенничество". По версии следствия, инспектор предлагала абитуриентам помощь в зачислении на бюджетную форму обучения в университете. Свои услуги она оценивала в 2.000 долларов. Об этом сообщил БелаПАН старший следователь по важнейшим делам отдела борьбы с организованной преступностью и коррупцией Гродненской областной прокуратуры Юрий Моисей.

Инспектора поймали с поличным в феврале. В ходе следствия было установлено четыре эпизода получения взяток. По словам Юрия Моисея, следствию так и не удалось доказать, что инспектор передавала полученные деньги другим должностным лицам университета, поэтому ей инкриминируется только мошенничество.

В ходе следствия по этому делу применялась программа защиты свидетелей, сообщил Юрий Моисей. Все персональные данные потерпевших и свидетелей скрывались от подследственной и всех, кто мог получить информацию о деле и впоследствии распространить ее.

"Мы предприняли специальные меры, так как некоторые свидетели являются студентами и опасаются, что потом в университете у них могут быть проблемы с преподавателями и администрацией, — сказал Юрий Моисей. — Но я уверен, что не примени мы программу защиты свидетелей, нам было бы сложнее добыть доказательную базу".

В уголовном деле все свидетели проходят не под собственными именами: прокуратура дала им специальные прозвища, расшифровка которых известна только прокурору области, следователю и ведущему судебный процесс судье.

В ходе следствия не могли производиться очные ставки и задаваться конкретные вопросы, по которым подследственная могла догадаться о личности свидетеля. Согласно программе защиты, даже допросы в суде будут производиться с мерами сохранения тайны.

